Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для іспыту па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 19. Варыянт 7**

## Білет 19.Практычнае заданне. Наш край у XIII-XVIII стст.

**Заданні склалі:** Лудзіч Андрэй Рамановіч ДУА «Гімназія№ 75 г. Мінска»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. На падставе прыведзенай карты вызначыце, у склад якіх адміністрацыйных адзінак уваходзіў горад Мінск у канцы XVI стагоддзя?
2. Якія гістарычныя падзеі закранулі вашага горада ў XVIII стагоддзі? Якім чынам яны адбіліся на лёсе вашых землякоў? Пры адказе выкарыстоўвайце карту 2.
3. З якой мэтай, паводле дакумента, Менску давалася магдэбургскае права? Назавіце дату гэтай падзеі. Што атрымліваў па магдэбургскім праве Менск? Хто, па новаму праву, меў судовую ўладу? За кім захоўвалася вярхоўнае права суда?
4. На аснове прадстаўленых крыніц зрабіце вывад аб палітычным, эканамічным і культурным развіцці Мінска ўXIII-XVIII стст.

**Крыніца I**




**Крыніца II**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца III.**

*З прывілея гораду Мінску*

…Мы, Аляксандр, Божай ласкай вялікі князь літоўскі, рускі, жамойцкі і іншых [зямель], даводзім да ведама гэтым нашым лістом… што, жадаючы прымножыць усеагульную выгоду і палепшыць становішча нашага горада Менска, каб нашы людзі, якія жывуць там, дзякуючы добраму і справядліваму ладу былі зацікаўлены, гэты наш горад Менск на права нямецкае, так званае магдэбургскае, пераводзім на вечныя часы. Пастанаўляем і даем ім магчымасць, згодна гэтаму магдэбургскаму праву, вяршыць поўнае кіраванне і адмяняць усе законы і звычаі, якія магдэбургскае права стрымліваюць, ўшчамляюць ці ж яму перашкаджаюць…

Жадаем таксама, каб усе жыхары названага горада Менска карысталіся гэтым правам магдэбургскім і ва ўсякай справе ва ўсім яго прытрымліваліся. Усіх тых людзей падаляем ад гарадскога і баярскага права і навечна вызваляем ад суда і ўлады ўсіх ваяводаў, паноў і старастаў, намеснікаў, суддзяў і ўсіх начальнікаў усяго Вялікага Княства Літоўскага такім чынам, што, калі па якой-небудзь справе [жыхары Менска] будуць выкліканы [апошнімі], яны маюць права не з'яўляцца і не адказваць ім. А калі хто ў чым будзе вінаваты, павінен па справядлівасці ўстаць перад войтам, бурмістрам і радцамі. Калі ж войт і бурмістры вырашаць несправядліва, тады па гэтай справе павінны будуць выклікаць да саміх нас і нам вырашаць, каго якім правам судзіць…